View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



зу 29 января 1904 г.; 2) разрешалось совмещать должность заведующего музеем М.Н. Муравьева с другими должностями по ведомству МВД. Совет министров также внес предложение о замене названия «Западный и Северо-Западный край» на перечисление губерний Виленской, Ковенской и Гродненской [10, л. 23, 39]. Официально с 1 января 1912 г. Виленское генерал-губернаторство было ликвидировано.

Таким образом, возникновение и существование Виленского генерал-губернаторства до начала XX в. было продиктовано необходимостью присоединения северо-западных губерний к империи, а затем для ликвидации последствий восстаний 1830–1831 и 1863–1864 гг. и интеграции края с остальными частями империи. Существование особой административный единицы – Виленского генерал-губернаторства, было обусловлено местными политическими и национально-религиозными особенностями. Одной из причин сохранения генерал-губернаторской власти в крае на протяжении всего XIX в. известный публицист А.В. Романович-Словатинский называл стремление правительства окончательно решить проблему крупного католического землевладения [14, с. 14]. Возникший в начале XX в. политический кризис, стремление к унификации управления империей и критические высказывания государственных сановников о широких правах генерал-губернаторовпривели к пересмотру их полномочий. Существование должности виленского генерал-губернатора нарушало стройность бюрократической системы и вносило дополнительные сложности при реализации политики на местах. Власти сделали ставку на усиление контроля губернаторской администрации за всей местной жизнью, в то время как институт Виленского генерал-губернаторства не вписывался в общую направленность административных реформ, выдвинутых в начале XX в.

### Литература и источники

1. *Ивановский, В.В.* Административное устройство наших окраин / В.В. Ивановский. – Казань: Тип. Императорского ун-та, 1891. – 47 с.; *Будилович, А.С.* Может ли Россия отдать инородцам свои окраины? / А.С. Будилович. – СПб.: Издание Н.Д. Сергеевского, заслуженного проф. СПб. ун-та, 1907. – 131 с.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII–пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – С. 49–51.; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XX ст. – У 2 кн. Кн. 1. / А.А. Каваленя [і інш]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – С. 66–68.
3. Институт генерал-губернаторства и наместничества в Российской империи. В 2 т. / под общ. ред. В.В. Черкесова. – СПб.: Изд-во «Юридический центр Пресс», 2003.; *Бахтурина, А.Ю.* Государственное управление западными окраинами Российской империи: 1905–февраль 1917 г.: дис. …д-ра ист. наук: 07.00.02 / А.Ю. Бахтурина. – М., 2006. – 545 л.
4. Памятка о времени учреждения и упразднения генерал-губернаторств. Справка по Северо-Западному краю от 4 ноября 1895 года. // Научно-справочная библиотека Российского государственного исторического архива. – Фонд 2916. – Ед. хр. 1.
5. Св. кн. Ник. Пл. Грузинский «Записка виленского губернатора о расширении полномочий губернаторов Северо-Западного края по применению особых узаконений и мероприятий, последовавших для губерний сего края» // Российский государственный исторический архив (РГИА). – Фонд 1016. – Оп. 1. – [1901 г.] – Д. 1003.
6. Дело об упразднении Виленского генерал-губернаторства (20 ноября 1910 г.). // РГИА. – Фонд 821. – Оп. 10. – Д. 1139.
7. *Тхоржевский, И.И.* Последний Петербург: Воспоминания камергера / И.И. Тхоржевский; сост. и прим. С.С. Тхоржевского. – СПб.: Алетейя, 2000. – 253 с.
8. Дневник П.А. Валуева, министра внутренних дел. / ред., введ., биографич. очерк и коммент. проф. П.А. Зайончковского. В 2 т. – Т. 2. 1865–1870. – М.: АН СССР, 1961. – 422 с.
9. Всеподданнейшие доклады. 1901 г. // РГИА. – Фонд 1284. – Оп. 241. – Д. 112.
10. Дело об упразднении Виленского, Ковенского и Гродненского генерал-губернаторства // РГИА. – Фонд 1409. – Оп. 6. – Д. 1029.
11. Государственной канцелярии особого совещания. Дело по Особому Совещанию под председательством члена Госсовета С.Ф. Платонова о передаче дел, имеющих местное значение из центральных государственных учреждений в учреждения местные (1903) // РГИА. – Фонд 1234. – Оп. 1. – Д. 1.
12. Дело об упразднении канцелярий Московского и Виленского, Ковенского и Гродненского генерал-губернаторов (1910 г.) // РГИА. – Фонд 1284. – Оп. 185. – 1910 г. – Д. 13.
13. Всеподданнейшие доклады. 1911 г. О назначении и увольнении служащих, выдаче пособий и др. // РГИА. – Фонд 1284. – Оп. 241. – Д. 128.
14. *Романович-Словатинский, А.В.* Генерал-губернатор или губернатор? / А.В. Романович–Словатинский. – Киев: Тип. И.Н. Кушнеров и Ко, 1889. – 15 с.

### Summary

*On the basis of archival documents the problem of liquidation of the Vilna General Governorate at the beginning of the XX century is revealed in the article. The author researched the points of view of the ministers and high bureaucracy of Russian Empire for existence of special governor system in the north-western provinces. The special attention is given to political, economical and social reasons and the mechanism of liquidation of the Vilna General Governorate in 1912.*

Поступила в редакцию 13.03.2013 г.

Рэпазіторый БДПУ

---

*УДК 930«18/19»:[94(476)«17/18»:63]*

***Н.К. Тукайла,***
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

## ГІСТАРЫЯГРАФІЯ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XX ст. АГРАРНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.

Канец XVIII – першая палова XIX ст. уяўляе сабой пераходны перыяд сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. У гэты час зараджаюцца новыя буржуазныя адносіны, што прыйшлі на змену старым, феадальна-прыгонніцкім. Праблема аграрных адносін заўсёды

з'яўлялася актуальнай, аднак і сёння застаецца ў шэрагу дыскусійных пытанняў. Адсутнасць абагульняльных прац па гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі перыяду генезісу капіталізму і неабходнасць аб'ектыўнага аналізу гісторыі пытання ўказаных працэсаў вызначылі прадмет для даследавання.

Першыя працы, прысвечаныя гісторыі Беларусі даследуемага перыяду, адносяцца да XIX ст. Змястоўнай з'яўляецца манаграфія М.В. Без-Карніловіча «Исторические сведения о примечательных местах Белоруссии» [1]. Нягледзячы на этнаграфічны характар кнігі і апавядальны стыль, аўтар сабраў рознабаковы фактычны матэрыял пра беларускія землі. М.В. Без-Карніловіч паспрабаваў ахарактарызаваць састаў насельніцтва, паўсядзённыя заняткі людзей і эканамічныя адносіны як паміж сабой, так і паміж насельніцтвам і дзяржавай. У раздзеле «Управление государственными имуществами» адзначаецца: «Для управления и попечительства над казенными крестьянами открыты в 1839 г. в белорусских губерниях Витебской и Могилевской под наблюдением Губернаторов особые Управления, названные Палатами Государственных имуществ. До их учреждения в обоих губерниях казенными крестьянами управляли Губернские Казенные Палаты. Все Государственные имения и свободные хлебопашцы в каждой губернии разделены на Округи, а те – на сельские общества. Для лучшего исполнения распоряжений Палаты и ближайшего наблюдения в Округе за устройством имений и благосостоянием крестьян установлен Окружный начальник; ему подчинены лесничий, офицеры, конные лесные объездчики, полесовщики и пожарные старосты» [1, с. 253–254]. Дастаткова падрабязна аўтар аналізуе ўнутраны і знешні гандаль на тэрыторыі Беларусі даследуемага перыяду. М.В. Без-Карніловіч таксама надае ўвагу паўсядзённаму жыццю сялян. Напрыклад, аўтар піша, што «скудный урожай хлеба, получаемый с обрабатываемой для себя земли, бедность и недостатки в житейских потребностях вынуждают белорусского крестьянина кроме земледелия искать другие средства, посредством которых он мог бы заработать деньги для уплаты лежащих на нем повинностей, и успокоения домашних нужд» [1, с. 298]. Насуперак расійскім гісторыкам, якія адзначалі беднасць беларускіх зямель, М.В. Без-Карніловіч робіць выснову аб тым, што зямля дае дрэнны ўраджай толькі тады, калі не атрымлівае належнага догляду, а «сельское хозяйство только тогда доставляет ожидаемые выгоды, когда производится людьми опытными и страстно приверженными хозяйству» [1, с. 307]. Аўтар характарызуе ўзаемаадносіны памешчыкаў і сялян: «Крестьяне сеют для себя количество хлеба, обеспечивающее их только в урожайные годы; при малых урожаях, собираемого со своих полей хлеба им недостаточно: тогда в пособие его получают от своих помещиков» [1, с. 307]. Акрамя таго, у працы М.В. Без-Карніловіча прысутнічае апісанне сельскагаспадарчай тэхнікі і спосабы апрацоўкі глебы.

Зразумела, што ўсе вышэйпералічаныя звесткі нельга аднесці да крытычнага матэрыялу, а факты, пералічаныя аўтарам, не дазваляюць поўна прааналізаваць праблему аграрных адносін перыяду генезісу капіталізму на беларускіх землях. Аднак гэта работа носіць этнаграфічны характар, і ў ёй змешчаны дастатковы фактычны матэрыял мясцовага ўзроўню, які дазваляе гісторыкам рабіць пэўныя высновы.

Значны крытычны матэрыял па вывучэнні гісторыі Беларусі змешчаны ў працы В.В. Турчыновіча «Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен» [2]. Аўтар характарызаваў Беларусь як самастойную дзяржаву: «Белоруссия имеет свою собственную историю, которую можно бы разделить на древнюю и новую. Ее древняя, ее собственная история, мало известна; новая же, начинающаяся с XV столетия, тесно связана с политической историей Литвы, Польши и России… позднейшая история с конца XVII ст. лишенная всякой самобытности… повторяет историю России и Польши» [2, с. VII, VIII]. Кіруючыся прынцыпам гістарыяграфіі канца XIX ст., В.В. Турчыновіч апісваў палітычную гісторыю, ігнаруючы сацыяльна-эканамічную. Завяршыў аўтар сваю працу дакладнай характарыстыкай беларускіх зямель перыяду канца XVIII – першай паловы XIX ст. [2, с. 239].

Яшчэ адной працай, у якой падаецца гісторыя беларускіх зямель, з'яўляецца выданне М.В. Каяловіча «Лекции по истории западной России» [3]. У ёй прасочваецца антыпольская пазіцыя аўтара. Беларускія землі аўтар называў ахвярай польскай экспансіі, а таксама адзначаў, што гэтыя тэрыторыі зведалі два іншаземныя ўплывы: рускі і заходні. Апошняе, на яго думку, негатыўна адбілася на сацыяльна-эканамічным становішчы краіны. Што датычыцца даследуемага намі перыяду, то М.В. Каяловіч пісаў: «Поляки не смогли выработать действительное благо для народа. Всеми улучшениями пользовалось шляхетство, а холопство также страдало» [3, с. 354]. Аналізуючы Канстытуцыю 1791 г., аўтар адзначаў, што «…в ней нет свободы холопству. Допущены только облегчения, например в том, что нельзя убить безнаказанно… холопство необходимо для шляхетства, шляхетство погибнет при малейшей воле холопства» [3, с. 357].

Такім чынам, у метадалогіі М.В. Каяловіча прасочваліся суб'ектыўныя рысы, характэрныя для пэўнага часу. Аўтар разглядаў беларускія землі як частку рускіх зямель і галоўным чынам

Рэпазіторый БДПУ

акцэнтаваў увагу на польскай экспансіі. Аднак аналіз сацыяльна-эканамічных працэсаў, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі, гісторык зрабіў толькі некалькі заўваг.

Вельмі скупы матэрыял, прысвечаны гісторыі Беларусі даследуемага перыяду, прысутнічае ў рабоце П. Шчабальскага «Рассказы Западной Руси» [4]. Працу можна хутчэй аднесці да клерыкальнага кірунку ў гістарыяграфіі. Гісторыя беларускіх зямель зведзена да гісторыі Праваслаўнай Царквы, наступам каталіцтва на ўніяцтва. Прыгнёт сялянства з боку князёў аўтар тлумвчыць фактарам рэлігійнай барацьбы [4, с. 125].

У канцы XIX ст. гісторыя Беларусі знайшла месца ў аглядных лекцыях В.В. Ключэўскага. Гісторык аналізаваў гісторыю беларускіх зямель як адну з частак Расійскай імперыі і называў пашырэнне тэрыторыі на захад як завяршэнне «естественных границ государства» [5, с. 542]. Акрамя кароткіх звестак пра гісторыю Беларусі, у раздзеле аб знешняй палітыцы можна сустрэць некаторыя факты, якія тычацца сацыяльна-эканамічных працэсаў, у прыватнасці, аграрных. У раздзеле «Преобразования первых лет императора Александра I» былі пералічаны некаторыя ўказы царскага ўрада, якія тычыліся новых тэрыторый. Так, быў названы Указ 12 снежня 1801 г., «предоставлявший лицам всех свободных состояний приобретать вне городов в собственность недвижимые имущества без крестьян; этим правом могли воспользоваться купцы, мещане, казенные крестьяне. Закон 12 декабря разрушил вековую землевладельческую монополию дворянства, которое одно дотоле пользовалось правом приобретать землю в личную собственность» [5, с. 550]. В.В. Ключэўскі аналізуе сялянскае пытанне ў межах усяго XVIII ст., аднак толькі ў адносінах да Расійскай імперыі.

Характэрнымі работамі, выкананымі ў кантэксце метадалогіі гістарыяграфіі канца XIX ст., з'яўляюцца манаграфіі П.Д. Бранцава «История Литовского государства с древнейших времен» (Вільня 1889 г.) і «Очерк Древней Литвы и Западной России» (Вільня, 1891 г.). Гісторыю Літвы аўтар падзяліў на пяць перыядаў. Нам найбольш цікавым уяўляецца апошні, які гісторык пачынае з падзелаў Польшчы. Нягледзячы на агульную палітычную накіраванасць прац, аўтар знаходзіць месца і для аграрных пытанняў. Так, П.Д. Бранцаў адзначае, што пасля першага падзелу Польшчы «нашлись некоторые лица, которые желали облегчить положение крестьян, таковыми, между прочим, были… и представили в 1776 году сейму проект об улучшении положения крестьян, но все восстали против проекта» [6, с. 572]. Ва ўсіх работах аўтара прасочваюцца некаторыя заўвагі адносна сацыяльна-эканамічнага жыцця беларускіх зямель даследуемага перыяду, аднак гэта больш нагадвае каментарыі, чым крытычны аналіз і аб'ектыўныя высновы.

Нельга не назваць такіх вядомых дасавецкіх аўтараў, як М.К. Любаўскага – рэктара Маскоўскага ўніверсітэта і вядомага выкладчыка літоўскай і заходнеславянскай гісторыі, паслядоўніка В.В. Ключэўскага, а таксама М.Ф. Уладзімірскі-Буданава – аўтара вядомай працы «Немецкое право в Польше и Литве». Аднак гэтыя гісторыкі не надавалі ўвагі аналізу сацыяльна-эканамічных, у прыватнасці, аграрных пытанняў. Яны былі, па-першае, прадстаўнікамі юрыдычнай школы, па-другое, характэрнай асаблівасцю даследаванняў таго перыяду з'яўлялася цікавасць да палітычнай гісторыі.

Можна зрабіць выснову, што даследчыкі канца XIX ст., якія пісалі гісторыю заходнерускіх зямель, закраналі і гісторыю Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. Шматлікія гісторыкі нават вызначалі беларускія землі ў якасці самастойнага аб'екта для вывучэння, што і паклала пачатак далейшым даследаванням. Агульным для ўсіх прац можна назваць вылучэнне палітычнай гісторыі, якое характарызуецца засяроджваннем ўвагі толькі на дзяржаўна-палітычных і царкоўна-рэлігійных аспектах. Аднак нельга не адзначыць першыя спробы і каментарыі, што тычацца сацыяльна-эканамічнага жыцця аграрнага кірунку ў прыватнасці.

Такім чынам, нельга сцвярджаць, што навукоўцы мяжы стагоддзяў зрабілі значны ўклад у даследаванне аграрнай гісторыі беларускіх зямель. Гэта было абумоўлена часам, у які працавалі гісторыкі (60-я гг. XIX – першыя гады XX ст.). Беларускія землі толькі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі і іх неабходна было інтэграваць у дзяржаву. Адсюль характэрныя антыпольскія канцэпцыі і прарасійскія погляды, інтарэс да палітычнай гісторыі ў якасці тлумачэння аб'яднання новых тэрыторый. Аднак усё вышэйпералічанае заклала падмурак для гісторыкаў, якія працавалі ў 20-я гг. XX ст., калі ўпершыню праявіўся інтарэс да аграрнай гісторыі Беларусі і пачалі закрывацца белыя плямы.

Адметнымі ў пачатку 20-х гг. XX ст. былі работы У.І. Пічэты: «История народного хозяйства России XIX – XX вв.» (Москва, 1922 г.) і «История крестьянских волнений в России» (Минск, 1923 г.). Аўтар дасканала аналізуе акрэсленыя праблемы і прыводзіць прыклады ў тым ліку з далучаных тэрыторый. У.І. Пічэта вызначыў працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця Расіі XIX ст. з улікам пашырэння зямель: пачатак развіцця прамысловага капіталу і разлажэнне прыгоннай гаспадаркі, развіццё ўнутранага і знешняга гандлю. Усе працэсы, на думку аўтара, былі ўзаемазвязаны, аднак гісторык іх не атаясамліваў. Варта адзначыць, што адной з прычын змен сацыяльна-эканамічнага развіцця, аўтар называе далучэнне новых тэрыто-

Рэпазіторый БДПУ

рый (Польшы, Літвы, Беларусі, Украіны). Навуковец даследуе сельскагаспадарчую палітыку і прыходзіць да высновы аб значным адрозненні ў становішчы і структуры сельскай гаспадаркі заходніх і ўсходніх губерняў Расіі. У.І. Пічэта падкрэслівае развіццё феадальнай гаспадаркі, радыкальныя змены сацыяльных адносін і адзначае, што найбольш практычныя гаспадары разумелі неабходнасць ліквідацыі прыгонных адносін, якія зжывалі сябе, а астатнія прыстасоўвалі сваю гаспдарку да аджыўшых форм.

М.В. Доўнар-Запольскі ўказвае на заняпад народнай гаспадаркі Беларусі ў XVIII ст. і адмаўляе яе істотныя змены, звязаныя з далучэннем да Расіі. Аўтар надае значную ролю селяніну ў працэсах развіцця народнай гаспадаркі і робіць вывад, што гаспдарка не можа развівацца station... 

Рэпазіторый БДПУ